1СБ 232759
91.9:83.3(4Беи)
Т50

Саюз пісьменнікаў Беларусі

# ТВОРЧЫ ПАРТРЭТ ПІСЬМЕННІЦКАЙ СУПОЛКІ

Біябібліяграфічны даведнік
Брэсцкага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

# ЛОКУН ВАЛЯНЦІНА ІВАНАЎНА
**(06.08.1946 – 16.06.2016 гг.)**

Нарадзілася ў в. Цепянец Пінскага раёна. Закончыла Цепянецкую пачатковую школу, вучылася ў Малоткавіцкай сярэдняй школе. А з сёмага класа, па прычыне хваробы ног, перайшла ў Пінскую завочную школу, якую і закончыла з залатым медалём. Вучылася ў Брэсцкім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А.С. Пушкіна (філалагічны факультэт, аддзяленне рускай мовы і літаратуры).

У 1974 годзе разам з сям'ёй пераехала ў г. Пінск. Закончыла аспірантуру пры Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У.І. Леніна. У 1984 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме: **«Праблемы стылю беларускай ваеннай прозы»**. (На матэрыяле творчасці В. Быкава, Б. Сачанкі, І. Чыгрынава).

Працавала загадчыцай Цепянецкай бібліятэкі (1972-1974), старшым выкладчыкам Брэсцкага педінстытута імя А.С. Пушкіна (зараз універсітэт) (1985-1998). З 1987 па 2007 гады супрацоўнік, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, з 1987 па 1998 гады, сумяшчаючы працу ў Інстытуце літаратуры з працай у педінстытуце.

Лаўрэат прэміі прэзідэнтаў Акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы (2004).

Двойчы лаўрэат прэміі часопіса «Полымя» (1993 і 2001).

Узнагароджана медалём Святой Еўфрасінні Полацкай – ад ГА «Міжнародны фонд Святой Еўфрасінні Полацкай» (2006).

Лаўрэат прэміі «Беларускага саюза жанчын» (2012).

Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1998, з 2006 года – член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Аўтар 147 навуковых артыкулаў па праблемах развіцця беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай літаратуры.

Пісала на беларускай і рускай мовах.

## АЎТАР КНІГ:

**«Да новых вышынь»:** зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў. (Мінск, «Мастацкая літаратура», 1991).

**«Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы. 50-60 гады»:** манаграфія (Мінск, «Навука і тэхніка», 1995).

**«Кругі жыцця, кругі літаратуры»:** зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў (Мінск, ОО БАКК, 2002).

**«Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры»:** манаграфія (Мінск, УП «Тэхнапрынт», 2005).

## ПУБЛІКАЦЫІ Ў НАВУКОВЫХ КНІГАХ:

**«Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.»:** У 4-х тамах. Том 4 у 3-х кнігах (Мінск, «Беларуская навука», 1999-2002, 2014). (Напісала 4 раздзелы).

**«Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей»** (Мінск, «Беларуская навука», 2002). В 2003 годзе «Нарысы» перакладзены на ўкраінскую мову і выдадзены ў Кіеве.

**«Беларуская літаратура ў кантэксце славянскіх літаратур XIX-XX стст.»** (Мінск, «Беларуская навука», 2006).

**«Васіль Быкаў: вядомы і невядомы»:** літаратуразнаўчае эсэ, успаміны (Мінск, «Літаратура і мастацтва», 2011).

## ПУБЛІЦЫСТЫКА:

**«Легенды і праўда жыцця»:** нарыс творчасці да 75-годдзя І. Шамякіна, «Полымя» (№ 1, 1996).

**«Творчы вопыт Алеся Асіпенкі»:** нарыс творчасці, «Полымя» (№ 7, 1996).

**«Іван Шамякін»:** нарыс творчасці, раздзел «Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя»: У 4-х т. Т. 3. (Мінск, «Беларуская навука», 2001).

**«Алесь Асіпенка»:** нарыс творчасці, раздзел «Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя»: У 4-х т. Т. 4, кн. 1. (Мінск, «Беларуская навука», 2002).

**«Уладзімір Дамашэвіч»:** нарыс творчасці, раздзел «Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя»: У 4-х т. Т. 4, кн. 1. (Мінск, «Беларуская навука», 2002).

**«Валянціна Коўтун»:** нарыс творчасці, раздзел «Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя»: У 4-х т. Т. 4, кн. 3. (Мн., «Беларуская навука», 2014).

**«О моём друге и покровителе»:** эссе, воспоминания о В.А. Ковалёнке, «Нёман» (№ 6, 2008).

**«Уладзімір Дамашэвіч: амплітуда таленту»:** нарыс творчасці, «Полымя» (№ 8, 2009).

**«Лестница, ведущая в духовную пропасть»:** очерк о творчестве, М. Южик, «Нёман» (№ 11, 2011).

**«Проза Уладзіміра Гніламёдава: адраджэнне нацыянальнага эпасу»:** нарыс, У. Гніламёдаў «Заставацца сабой…» (Мінск, 2012).

**«Супраць духоўнай пустаты»:** нарыс творчасці, У. Дамашэвіч, «Полымя» (№ 5, 2012).

**«Феномен Уладзіміра Гніламёдава»:** нарыс, «Звязда» (25.08.2012).

**«Мікрасвет, у якім увасоблены макрасвет»:** нарыс, штрыхі да творчага партрэта Алеся Карлюкевіча, «Роднае слова» (№ 6, 2013).

**«Олег Ждан: траектория жизни – траектория таланта»:** очерк о творчестве, «Нёман» (№ 11, 2013); «Наш современник» (№ 7, 2014).

**«Пакліканая»:** нарыс пра творчасць В. Коўтун, «Полымя» (№ 2, 2016).

**«Аналітычны стыль Васіля Быкава»:** артыкул, «Полымя» (№ 4, 1983).

**«Сучасны беларускі раман. Да праблемы развіцця жанру»:** артыкул, «Полымя» (№ 12, 1983).

**«На шляху да сінтэтычнасці»:** артыкул, «Полымя» (№ 3, 1984).

**«Стилевое своеобразие современной белорусской военной прозы»:** на матэрыяле творчасці В. Быкава, Б. Сачанкі, І. Чыгрынава. 60-70 гады, аўтарэферат (Мінск, 1984).

**«Структура канфлікту і праблемы маральнага пошуку ў беларускай аповесці 70-х – пачатку 80-х гадоў»:** артыкул (зб. «Беларуская літаратура». Выпуск 16 (Мн., «Выдавецтва «Універсітэцкае», 1985).

**«Героі і час»:** артыкул, «Полымя» (№ 2, 1986).

**«У пошуках маральнага ідэалу. Проза Уладзіміра Караткевіча»:** артыкул, «Полымя» (№ 6, 1993).

**«Вялікі свет маленькіх Куранёў. Да праблемы зямлі, чалавека і ўлады»:** артыкул, «Полымя» (№ 3, 1994).

**«Настальгія па мінулым, альбо Прага духоўнасці»:** рэцэнзія на кн. І. Шамякіна «Сатанінскі тур», «ЛіМ» (22.03.1996).

**«Крыж праз усё жыццё»:** рэцэнзія на кн. В. Коўтун «Крыж міласэрнасці». Кніга другая. «Полымя» (№ 7-8, 1995); «ЛіМ» (13.12.1996).

**«Літаратура, час, героі. Беларуская проза-96»:** артыкул, «Полымя» (№ 10, 1997).

**«Літаратура і свабода выбару. Экзістэнцыяльныя кірункі твораў В. Быкава»:** артыкул, «Полымя» (№ 5, 1998).

**«Малая проза-97»:** артыкул, «Полымя» (№ 12, 1998).

**«У пошуку маральнага ідэалу»:** артыкул «Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім кантэксце». Навуковы зборнік (Мн., «Кнігазбор», 2000. Беларусіка-Heba-ruthenika, кн. 16).

**«Узняцце да лёсу агульначалавечага». (Талстоўскія традыцыі ў развіцці беларускай ваеннай прозы. Да праблемы філасофіі гісторыі):** артыкул, «Полымя» (№ 5, 2001).

**«У атмасферы барацьбы»:** у 2-х частках артыкул, «Полымя» (№ 1-2, 2002).

**«На духоўным пераломе. Агляд прозы апошніх гадоў»:** артыкул, «Полымя» (№ 9-10, 2002).

**«Вайна і мір Л. Талстога і развіццё беларускай і ўкраінскай ваеннай прозы першай паловы XX ст.: канцэпцыя гісторыі і чалавека»:** артыкул, «Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей» (Мн., «Беларуская навука», 2002).

На ўкраінскай мове. **«Вайна і мір» Л. Талстога і развіццё беларускай і ўкраінскай ваеннай прозы першай паловы XX ст.: канцэпцыя гісторыі і чалавека»:** артыкул, «Нарисы білорусько-українських літературних зв'язків», пераклад Г. Півторака (Кіеў, 2003).

**«У абсягах «літаратурнага факта»:** артыкул, «Полымя» (№ 5, 2003).

**«Иван Шамякин: в поиске нравственного идеала» (конец XX – начало XXI вв.):** артыкул, «Нёман» (№ 10, 2003).

**«Проза-2003: духовные поиски и художественные решения»:** артыкул, «Нёман» (№ 4, 2004).

**«Вайна – не толькі поле было»:** артыкул. Да 80-годдзя В. Быкава, «Беларуская думка» (№ 6, 2004).

**«Празаік эпічнага таленту»:** артыкул. Да 70-годдзя І. Чыгрынава, «Беларуская думка» (№ 12, 2004).

**«Еще раз о лейтенантах...»:** рэцэнзія на ваенную прозу М. Еляноўскага, «Полесская правда» (26.03.2005), «Нёман» (№ 9, 2005).

**«Вайна і мір» Кузьмы Чорнага»:** артыкул, «Беларуская думка» (№ 4, 2005).

**«Современная проза писателей Пинска»:** даклад «Материалы международной научно-практической конференции, посвященной Дням науки Пинщины», (Пінск, 2006).

**«Можно ли найти камень в пустыне»:** рэцэнзія, Ю. Саланевіч, «Зона тени», «Нёман» (№ 4, 2006).

**«Вобразна-жанравыя асаблівасці беларускага рамана 40-х – пачатку 50-х гадоў у кантэксце славянскіх літаратур»:** артыкул «Беларуская літаратура ў кантэксце славянскіх літаратур XIX – XX стст.» Калектыўная манаграфія (Мн., «Беларуская навука», 2006).

**«Человек на войне»:** творчасць В. Быкава. Пераклад В. Барысевіча (фрагмент манаграфіі), «Нёман» (№ 5, 2007).

**«Пинщина литературная»:** аглядны артыкул, «Нёман» (№ 8, 2007).

**«Пакліканыя і абраныя. Узыходжанне пісьменніцы»:** рэцэнзія на кн. В. Коўтун «Пакліканыя», «Полымя» (№ 2, 2008).

**«Проза Уладзіміра Гніламёдава»:** артыкул, «Полымя» (№ 2, 2009).

**«Белорусская проза XXI века и постмодернизм»:** артыкул, «Нёман» (№ 3, 2009).

**«Берасцейскае шматгалоссе»:** артыкул, «Маладосць» (№ 8, 2011).

**«Исследование, которого ждали давно»:** рэцэнзія на кн. М. Мікуліча «Паэзія Заходняй Беларусі 1921-1939», «Нёман» (№ 4, 2012).

**«Настальгія па страчанаму раю»:** рэцэнзія на кн. А. Федарэнка «Дзікі луг», часопіс «Маладосць» (№ 12, 2012).

**«Новае ў беларускай кампаратывістыцы»:** рэцэнзія на кн. «Літаратурная карта Еўропы: кантакты, тыпалогія, інтэртэкстуальнасць». Нав. рэд. М.У. Мікуліч. Мн., 2012. BiALoRuTeNistyKA BiALOSTOCKA. Том 4. BiAlystok, 2012.

**«На літаратурнай карце Еўропы»:** рэцэнзія на кн. «Літаратурная карта Еўропы: кантакты, тыпалогія, інтэртэкстуальнасць» (Мн., 2012). Весці № 1 НАН Беларусі (Мн., «Беларуская навука», 2013). Серыя гуманітарных навук.

**«Сучасная беларуская кампаратывістыка: глыбіня і маштабнасць пошуку»:** па старонках манаграфіі «Літаратурная карта Еўропы: кантакты, тыпалогія, інтэртэкстуальнасць» (Мн., 2012), рэцэнзія, «Полымя» (№ 1, 2013).

**«Белорусско-русские литературные взаимосвязи»:** рэцэнзія на зб. «Беларуская і руская літаратуры: тыпалогія ўзаемасувязей і нацыянальнай ідэнтыфікацыі»: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. Мінск, 18-19.04.2012. Уклад. А.В. Вальчук. – Мінск: «Права і эканоміка», 2012, «Нёман» (№ 2, 2013).

**«О Максиме Танке, известном и неизвестном, или Когда забываешь, что ты критик...»:** рэцэнзія, М. Мікуліч, «Максім Танк: талент, заручаны з небам», «Нёман» (№ 4, 2013).

**«По страницам белорусско-русского литературного диалога»** рэцэнзія на зб. «Беларуская і руская літаратуры: тыпалогія ўзаемасувязей і нацыянальнай ідэнтыфікацыі»: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. Мінск, 18-19.04.2012 г. Уклад. А.В. Вальчук. – Мінск: «Права і эканоміка», 2012. Весці № 2 НАН Беларусі (Мн., «Беларуская навука», 2013). Серыя гуманітарных навук.

**«Цэнтрам быційнай прасторы»:** аглядны артыкул пра берасцейскіх пісьменнікаў, «Маладосць» (№ 10, 2013).

**«Птахі з падрэзанымі крыламі. Фрэдэрык Стэндаль і Змітрок Бядуля: да праблемы свабоды і чалавека»:** артыкул, «Полымя» (№ 11-12, 2013).

**«Атлантыда Анатоля Крэйдзіча»:** рэцэнзія на кнігу «Роднае, шчымлівае», «Маладосць» (№ 2, 2013).

**«Мастацкі код Алены Браво»:** артыкул на кн. «Дараванне», «Полымя» (№ 3, 2014).

**«Вайна і мір Уладзіміра Гніламёдава»:** артыкул, «Полымя» (№ 9, 2014).

**«Вайна як трагедыя народнага лёсу ў творчасці У. Гніламёдава»:** даклад «Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні»: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 7-8.10.2014) прадм. і ўклад. С.Л. Гараніна; навук. рэд. А.І. Лакотка Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Мінск, «Права і эканоміка», 2014, 368 с. – С. 190-197.

**«Алесь Карлюкевіч – казачнік»:** артыкул, «Роднае слова» (№ 12, 2014).

**«Военная проза Владимира Гниломёдова»:** артыкул, «Нёман» (№ 1, 2015).

**«Вайна як трагедыя народнага лёсу ў творчасці Уладзіміра Гніламёдава»:** артыкул, «Роднае слова» (№ 3, 2015).

**«Последние романтики XIX столетия»:** артыкул, «Нёман» (№ 8, 2015).

**«Вайна як трагедыя народнага лёсу»:** артыкул, «Полымя» (№ 8, 2015).

**«Дарогі варта выбудоўваць у розных накірунках»:** «Полымя» (№ 1, 2016) і інш.

**АБ ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ АЎТАРА ПІСАЛІ:**

**«ПАМЯЦЬ»:** гісторыка-дакументальная хроніка Пінскага раёна (Мінск, «БЕЛТА», 1998).

**«Ученые Пинщины»**. – Мн.: Экономика и право, 2003. – 160 с.

**«Літаратурная карта Берасцейшчыны»:** навукова-папулярнае выданне (Брэст, «Брэсцкая друкарня», 2008).

## ЛЯШУК МАРЫЯ ІВАНАЎНА
**(нар. 27.09.1955 г.)**

Нарадзілася ў вёсцы Табулкі Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і калгаснікаў. У 1973 годзе закончыла Табульскую сярэднюю школу і паступіла на факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Завяршыўшы навучанне ў 1978 годзе, вярнулася ў Пінск і стала працаваць карэспандэнтам, а потым рэдактарам мясцовага радыё ў трыкатажным аб'яднанні «Палессе». У 1990 годзе перайшла працаваць карэспандэнтам у новую газету «Пінскі веснік». Праз некаторы час была прыз-